# РОЛЯ ПЕЙЗАЖУ Ў ФАРМІРАВАННІ ЭКАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ АСОБЫ

***Сяліцкі Аляксандр Леанідавіч,***
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка» (Рэспубліка Беларусь)

*Анатацыя*. У артыкуле разглядаецца актуальная праблема фарміравання экалагічнай культуры асобы сродкамі пейзажу. Адзначаецца, што ў працэсе пераходу да каэвалюцыйнай мадэлі сацыяпрыроднага ўзаемадзеяння істотнай з'яўляецца пераарыентацыя грамадскай свядомасці на ашчаднае стаўленне да прыроды, разуменне яе этыка-эстэтычнай каштоўнасці. На гэтым напрамку культуралагічнае даследаванне пейзажу дазваляе вылучыць у яго семантычнай структуры парадыгмальную арыентацыю на ўспрыманне мастацкай і грамадскай свядомасцю прыроды як духоўнага эталона, вобраза ўніверсальнай творчай сілы і сусветнага парадку. Адзначаны аксіялагічны змест мастацкага пейзажу спрыяе фарміраванню антрапапрыроднай парадыгмы.

*Ключавыя словы*: экалагічная культура; устойлівае развіццё; каэвалюцыя; наасфера; антрапапрыродная парадыгма; пейзаж.

На сучасным этапе сусветнага цывілізацыйнага працэсу адной з глабальных праблемаў з'яўляецца гарманічнае суразвіццё (каэвалюцыя) чалавека і прыроды. Разуменне агульнасці лёсу прыроднага і чалавечага свету, якое стыхійна прысутнічала ў грамадскай свядомасці на ранніх стадыях культурагенезу, зараз набывае значэнне рацыянальна абгрунтаванай мэты чалавецтва, галоўнай умовы захавання жыцця на планеце. Неабходнасць выпрацоўкі каэвалюцыйнай мадэлі сацыяпрыроднага ўзаемадзеяння стала відавочнай ужо на пачатку XX ст., калі, па словах акадэміка У. І. Вярнадскага (1863–1945), «упершыню ў гісторыі Зямлі <...> чалавецтва сваім жыццём стала адзіным цэлым» [2, с. 308]. Менавіта ў гэты час шэраг вучоных (Э. Леруа, П. Тэяр дэ Шардэн, У. І. Вярнадскі) распрацавалі ідэю станаўлення сферы розуму – наасферы – у якасці стратэгічнай мэты далейшага развіцця чалавецтва, якая павінна рацыяналізаваць цывілізацыйны працэс і тым самым забяспечыць выжыванне людзей.

У шырокі навуковы ўжытак тэрмін «наасфера» ўвёў французскі філосаф і матэматык Э. Леруа (1870–1954) у сваёй працы «Патрэба ў ідэалізме і факт эвалюцыі» (1927). Выкарыстоўваючы ідэі А. Бергсона, У. І. Вярнадскага, П. Тэяра дэ Шардэна, ён лічыў, што далейшы накірунак эвалюцыі на планеце звязаны з пераходам да эпохі, калі вырашальнае значэнне набудуць думка і дух. У многім блізкай да поглядаў Э. Леруа была пазіцыя У. І. Вярнадскага ў адносінах да наасферагенезу, які ён разглядаў не толькі як працэс сацыяльных ці духоўна-інтэлектуальных зменаў, але і як заканамерную стадыю біясферна-геалагічнай эвалюцыі. У эсэ «Некалькі слоў пра наасферу» (1943–1944) вучоны пісаў: «Наасфера ёсць новая геалагічная з'ява на нашай планеце. У ёй упершыню чалавек становіцца найбуйнай геалагічнай сілай» [2, с. 309]. Дзякуючы здольнасці мысліць і ствараць, перад чалавецтвам адкрываецца вялізарная будучыня, калі толькі, як папярэджвае У. І. Вярнадскі, яно «не будзе ўжываць свой розум і сваю працу на самавынішчэнне» [2, с. 308]. У некалькі іншым, рэлігійна арыентаваным накірунку развіваў канцэпцыю наасферы П. Тэяр дэ Шардэн (1881–1955). Наасфера ў разуменні вучонага ўяўляе сабою якасна новы стан канцэнтрацыі свядомасці, якая ўтварае адмысловую сферу духу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што пакрывае Зямлю. Падобна да біясферы, яна з'яўляецца яшчэ адной зямной абалонкай, якая разгортваецца па-за біясферай і над ёй. У сваёй шырокавядомай працы «Феномен чалавека», напісанай у 1938–1940 гг. і надрукаванай у 1955 г., П. Тэяр дэ Шардэн адзначаў, што наасфера ўяўляе сабой звышіндывідуальны феномен планетарнага ці, нават, сусветнага маштабу, які не зводзіцца да сумы асобных свядомасцяў людзей, а з'яўляецца безумоўна большай з'явай.

Вызначаныя Э. Леруа, У. І. Вярнадскім, П. Тэярам дэ Шардэнам перспектывы далейшага развіцця сучаснай цывілізацыі выразна сведчаць пра тое, што чалавецтва знаходзіцца на тым этапе, калі павінна планаваць уласную глабальную пераўтваральную дзейнасць з абавязковым улікам яе наступстваў для планеты. У працэсе пераходу да каэвалюцыйнай мадэлі сацыяпрыроднага ўзаемадзеяння важнай з'яўляецца пераарыентацыя грамадскай свядомасці на ашчаднае стаўленне да прыроды, разуменне яе як этыка-эстэтычнай каштоўнасці. У сувязі з гэтым акадэмік М. М. Маісееў (1917–2000) у артыкуле «Каэвалюцыя прыроды і грамадства. Шляхі наасферагенезу» (1997) справядліва заўважыў, што «па сутнасці, у аснове тэорыі наасферагенезу ляжаць новыя прынцыпы маральнасці, новая сістэма нораваў, якая павінна быць універсальнай для ўсёй планеты, пры ўсім адрозненні цывілізацый народаў, якія яе насяляюць <…>. Ва ўмовах экалагічнага крызісу, які ўжо наступіў, <…> структура грамадскага ўладкавання павінна зведаць кардынальныя змены» [4].

Неабходнасць выпрацоўкі ў глабальным маштабе мераў па супрацьстаянню негатыўным выклікам несбалансаванай чалавечай дзейнасці на планеце стала асноўнай прычынай правядзення Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі (Стакгольм, 1972). Складанасць і маштабнасць вынесеных у павестку Канферэнцыі праблем абумовілі фарміраванне ў структуры ААН Сусветнай камісіі па пытаннях навакольнага асяроддзя і развіцця (ЮНЕП). У 1987 г., пасля распрацоўкі і абмеркавання розных падыходаў, Камісія апублікавала даклад «Наша агульная будучыня», у якой была абгрунтавана канцэпцыя ўстойлівага развіцця (анг. sustainable development). У прыватнасці, у дакуменце адзначалася, што «ўстойлівае і даўгачаснае развіццё ўяўляе сабою не нязменны стан гармоніі, а хутчэй працэс змен, у якім маштабы эксплуатацыі рэсурсаў, кірунак капіталаўкладанняў, арыентацыя тэхнічнага развіцця і інстытуцыйныя змены дапасуюцца з цяперашнімі і будучымі патрэбамі» [1, с. 25].

Відавочна, што пераход да ўстойлівага развіцця заканамерна вымагае радыкальнай трансфармацыі матэрыяльнай і духоўнай культуры чалавецтва на базе экалагічных і гуманістычных каштоўнасцяў. Станаўленне новай парадыгмы развіцця сучаснай цывілізацыі, заснаванай на прынцыпе каэвалюцыі чалавека і прыроды, выступае шматаспектнай з'явай, якая ўключае ў сабе розныя сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя, экалагічныя, культурныя, адукацыйныя і іншыя фактары. Аднак ядром гэтага працэсу з'яўляецца, перш за ўсё, разуменне грамадствам прыроднага свету як безумоўнай каштоўнасці, таго не толькі матэрыяльнага, але і духоўнага рэсурсу, без уліку якога немагчыма далейшае ўстойлівае развіццё сучаснай цывілізацыі. У гэтым накірунку значную ролю адыгрывае фарміраванне экалагічнай культуры, ідэйным базісам якой можа служыць імператыў «замілаванне жыццём» (ням. «*Ehrfurcht vor dem Leben*»), сфармуляваны А. Швейцэрам яшчэ ў першай палове XX ст. У такім



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ракурсе праблемы па-новаму можа быць выкарыстаны семантыка-кагнітыўны патэнцыял пейзажу, у якім *a priori* закладзена парадыгмальная арыентацыя на самакаштоўнасць прыроды, на яе арганічную злучанасць з чалавечым светам. Адзначаная аксіялагічныя аснова пейзажу робіць яго адным са значных кампанентаў у фарміраванні экалагічнай культуры асобы. У гэтым працэсе вядучую ролю адыгрывае ідэя канвергенцыі прыроднага і сацыяльнага, якая, з аднаго боку, знаходзіць адлюстраванне ў вобласці мастацкай творчасці, а, з другога, – служыць рацыяналізаванай асновай новай культурнай дамінанты. Вызначаючы галоўныя характарыстыкі экалагічнай культуры, Н. М. Мамедаў у працы «Культура, экалогія, цывілізацыя» (1996) адзначыў, што «калі існасцю культуры ў шырокім сэнсе слова заўсёды было адрозненне сацыяльнага ад прыроднага, то існасцю экалагічнай культуры з'яўляецца, наадварот, сумяшчэнне сацыяльнага з прыродным, іх адзінства» [3, с. 15]. Відавочна, што экалагічная культура павінна стаць спосабам злучэння чалавека з прыродай, паяднання яго з ёй на аснове глыбейшага яе пазнання, выпрацоўкі новых маральна-этычных нормаў грамадскай жыццядзейнасці.

У семантычным змесце пейзажа можна вылучыць некалькі кампанентаў, якія адыгрываюць значную ролю ў станаўленні экалагічнай культуры і фарміраванні каэвалюцыйнай парадыгмы: эстэтычны, маральна-этычны, светапоглядны. Кожны з іх валодае самастойнай функцыяй у структуры цэлага – мастацкага вобраза прыроды, і, разам з тым, утрымлівае культурныя сэнсы, што дазваляе знаходзіць карэлятыўныя сувязі паміж мастацкай і філасофскай інтэрпрэтацыяй твора. Філасофскі сінтэз садзейнічае ўзбуйненню адзінак значэнняў мастацкага феномена, дазваляючы ўзняцца да ўзроўню канцэптуальнай карціны свету, выражанай сродкамі мастацкай рэпрэзентацыі. У такім аспекце пейзаж прадстае як дыялагічнае ўзаемадзеянне прыроднага і чалавечага свету, у якім прырода выступае этыка-эстэтычным эталонам. Эстэтычная функцыя прыроды ў пейзажы цесна звязана з маральна-этычнай, бо прыродны свет выступае ў творах не толькі вобразам гармоніі і хараства, але і носьбітам думак і перажыванняў людзей. Пры гэтым прырода з'яўляецца свайго роду камертонам, адносна якога вызначаецца дасканаласць чалавечага існавання. Гарманічнасць будовы і ўзаемасувязі ўсіх элементаў прыроднага свету на розных этапах гісторыка-культурнага працэсу выступала вобразам ідэальнага сусветнага парадку, да якога чалавек імкнуўся далучыцца. Напрыклад, у культуры старажытных цывілізацый адным з цэнтральных быў вобраз Прыроды-маці (Багіні-маці), у якім сканцэнтраваліся ўяўленні людзей пра вітальную сілу прыроды. У традыцыйным пейзажным мастацтве Кітая прырода трактавалася як увасабленне «шляху-дао», якім людзі павінны ісці ў напрамку самадасканалення і спасціжэння схаванай сутнасці рэчаў. У еўрапейскай культуры часоў позняга Сярэднявечча і Рэнесансу цікавасць да свету зямной рэчаіснасці была звязана з разуменнем яго як адлюстравання Боскай дасканаласці. Пазней, ужо ў рамантызме, прырода набыла самастойны статус, выступіўшы вобразам універсальнага творчага пачатку, крыніцай натхнення і эталонам свабоднага існавання. Відавочна, што этыка-эстэтычны змест пейзажу ў многім фундаваны культурнымі сэнсамі пэўнай гістарычнай эпохі, але канстантнай з'яўляецца парадыгмальная арыентацыя ў ім на вобраз прыроды як на



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адухоўленую існасць, якая, з аднаго боку, здольная да ўзаемадзеяння з асобай на эмацыянальна-пачуццёвым узроўні, а, з другога, выступае сінтэзнай праекцыяй чалавечых уяўленняў пра дасканаласць светабудовы. Можна сказаць, што і стварэнне пейзажу аўтарам, і ўспрыманне яго рэцыпіентам – гэта акт камунікацыі асобы з прыродным светам, своеасаблівы дыялог, у працэсе якога раскрываецца духоўная тоеснасць прыроды і чалавека, што садзейнічае фарміраванню адпаведнай светапоглянай установкі. Прырода і асоба існуюць у пейзажы як два раўнапраўныя пачаткі, што ў філасофскім аспекце можа разглядацца як адзін з фактараў пераадолення антрапацэнтрызму і выйсця на шлях станаўлення антрапапрыроднай парадыгмы сучаснага цывілізацыйнага развіцця, заснаванай на каэвалюцыйнай мадэлі сацыяпрыроднага ўзаемадзеяння.

Такім чынам, пейзаж адыгрывае важную ролю ў канструяванні цэласнай карціны свету, у якой супрацьпастаўленне суб'екта і аб'екта, грамадства і прыроды змяняецца адносінамі тоеснасці і дыялагічнасці. У гэтым працэсе істотным момантам з'яўляецца фарміраванне экалагічнай культуры, інтэгральны характар якой павінен забяспечыць разуменне людзьмі ідэі непарыўнай узаемасувязі сацыяльнага, навукова-тэхнічнага праграсу і стану навакольнага асяроддзя. Закладзены ў пейзажы этыка-эстэтычны змест арыентуе свядомасць на ўспрыманне прыроды як роднаснай чалавеку існасці, як вобраза сусветнай гармоніі і хараства, спасціжэнне якіх выступае неад'емнай часткай маральнага дасканалення асобы. Такая светапоглядная ўстаноўка спрыяе таму, што працэсы дывергенцыі прыроднага і сацыяльнага паступова змяняюцца рухам да канвергенцыі, якая праяўляецца ў ашчадным стаўленні да навакольнага асяроддзя, рацыянальнай і збалансаванай пераўтваральнай дзейнасці чалавека на планеце, укараненні ў грамадскай жыццядзейнасці нормаў універсальнай этыкі.

### *Літаратура*

1. Брундтланд, Г. Х. Наше общее будущее / Г. Х. Брундтланд и др. // Доклад Всемирной комиссии по вопросам окружающей среды и развития. – ООН, 1987. – 412 с.
2. Вернадский, В. И. Несколько слов о ноосфере / В. И. Вернадский // Грёзы о Земле и Небе : Антология русского космизма / Сост., вступ. ст., коммент. О. А. Карчевцева. – Спб. : Худож. лит., 1995. – С. 303–311.
3. Мамедов, Н. М. Культура, экология, образование / Н. М. Мамедов. – М. : Российское экологическое федеральное информационное агентство, 1996. – 52 с.
4. Моисеев, Н. Н. Коэволюция природы и общества. Пути ноосферогенеза [Электронный ресурс] / Н. Н. Моисеев // Экология и жизнь. – 1997. – № 2–3. – Режим доступа: http://www.ecolife.ru/jornal/echo/1997-2-1.shtml. – Дата доступа: 06.05.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РОЛЬ ЭСТЕТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ В ОБРАЗОВАНИИ СТУДЕНТОВ-АРХИТЕКТОРОВ

***Хаджи-Бандалак Мариана Михаил,***
Технический университет Молдовы (Республика Молдова)

*Аннотация.* В данной работе анализируется основные составляющие эстетического воспитания, помогающего студентам-архитекторам осваивать эстетическую культуру. В зависимости от культурного контекста, студентам-архитекторам важно иметь возможность использовать визуальные средства, помогающие наблюдателю воспринимать заложенный автором в произведение архитектуры эстетический смысл.

*Ключевые слова:* эстетика; эстетическое воспитание; искусство; красота; студенты-архитекторы.

Тенденции, возникшие на основе авангардно-модернистско-постмодернистского художественно-эстетического опыта, акцентируют важность эстетической культуры в педагогической деятельности. Профессиональное обучение уделяет особое внимание компетенции и совершенствованию при обучении студента. Гибкость, креативность и нестандартность – необходимые составляющие воспитательного процесса. С нашей точки зрения, деятельность университетских кадров должна быть ориентирована на развитие творческих способностей студентов-архитекторов на основе повышения их эстетической культуры, способствуя структурированию компетенций, визуальных, художественных и пластических навыков, наблюдений, анализа, памяти, воображения, импровизации, инноваций. Красота и креативность позволяют студентам-архитекторам основательно изучать предмет, эффективно и правильно используя базовые понятия, а также сознавая красоту цветовых сочетаний в архитектурных формах. Соединение творчества и инноваций помогают в освоении культурных ценностей.

Сегодня проблема эстетического воспитания, разработка его методов и методик стала одной из главных проблем и задач в системе воспитания и образования студентов, изучающих архитектуру. В. А. Салеев говорил, что «архитектура призвана служить удовлетворению как утилитарных, так и духовных человеческих потребностей, поэтому в ней воедино сливается польза и красота, функциональное эстетическое начала» [3, с. 122].

Нашей целью является развернутое изложение эстетической теории, совокупности художественных средств и приемов, включающей выбор архитектурных форм, их пропорций и декоративных украшений, формирующих архитектурный стиль той или иной эпохи или национальной культуры. Однако в жизни трудно найти прекрасную форму, и поэтому студент, обучаясь архитектуре, должен уметь извлекать из всего природного разнообразия самые красивые элементы и соединять их в единое целое. Следовать своей же фантазии студенты-архитекторы могут только в том случае, если прекрасный образ, сложившийся в воображении, стал результатом долгой практики наблюдений и зарисовок красивых фигур.

Сущностью красоты, по мнению художника и архитектора Леона Батиста Альберти, является гармония: «красота есть строгая соразмерная гармония всех частей, – такая, что ни прибавить, ни убавить, ни изменить ничего нельзя, ни сделав хуже». Он признаёт основой архитектурной постройки соединение «прочности, пользы и красоты». Понятие красоты является одним из важнейших критериев оценки произведений искусства, красота и польза оказываются при этом неразрывно связанными [2, с. 135].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ